**Беларуская** Грэка-Каталіцкая (Уніяцкая) Царква
**Сьвятых** Апосталаў Пятра і Паўла ў Лёндане

**ВЫБРАНЫЯ** СЛУЖБЫ ВЕЛІКОДНАГА ПЕРЫЯДУ

---------

# СЛУЖБЫ АД ПАЛОВЫ СЬВЯТА ДА КАНЦА ВЯЛІКАДНЯ

**Лёндан 1997**

# ПАЛОВА СЬВЯТА

## ВЯЧЭРНЯ Ў АЎТОРАК

**На "Госпадзе, Цябе клічу..."** *наступныя песьні, паўтараючы кожную:*

(*Тон 4*). Настала сярэдзіна дзён між збавенным Уваскрасеньнем і Боскай Сёмухай. Прасьветленая зьзяньнем абодвух сьвятаў, яна злучае іх у адно і аб'яўляе славу Гасподняга ўзьнясеньня.

Сыён пачуў вестку пра ўваскрасеньне Хрыстова і ўзрадаваўся, а верныя сыны ягоныя ўсьцешыліся, калі ўбачылі, як агіда хрыстазабойства абмываецца Духам. Усё стварэньне рыхтуецца ўрачыста сьвяткаваць радаснае перапалаўленьне двух сьвятаў.

Набліжаецца, як напісана, шчодрае выліцьцё Боскага Духа на ўсіх, і сёньняшні дзень прадвяшчае спаўненьне абяцаньня, якое даў Хрыстос вучням сваім, калі пасьля сьмерці, пахаваньня і ўваскрасеньня свайго, абвясьціў ім прыйсьце Пацяшыцеля.

Слава ... цяпер ...

(*Тон 6*). Сабраўшыся, каб адзначыць сярэдзіну дзён між Тваім, Хрысьце, уваскрасеньнем і прыйсьцем Духа Боскага Твайго, славім у песьнях таямніцу цудаў Тваіх і просім пасланць нам багацьце Твайго зьмілаваньня.

**Чытаньне кнігі прарока Міхея**

Так кажа Госпад: "З Сыёну выйдзе закон, і слова Гасподняе з Ерусаліму; і будзе судзіць многіх людзей, і асуджаць магутныя народы далёкія." Бо ўсе людзі пойдуць, кожны сваёй дарогаю, а мы пойдзем у імя Госпада Бога нашага сёньня і давеку. Так кажа Госпад Усемагутны: "Пачуйце, горы, суд Гасподні, і слухайце пільна, асновы зямлі, бо вось Госпад будзе судзіцца з народам сваім, Ён будзе абвінавачваць Ізраіля, кажучы: Народзе мой, што Я табе ўчыніў, чым Я цябе засмуціў? Адкажы мне! Я ж вывеў цябе з зямлі ягіпскай, з дому няволі Я вызваліў цябе; і паслаў перад абліччам тваім Майсея і Аарона, і Марыям. Народзе мой, прыгадай, як раіліся супраць цябе ворагі твае. Хто абвясьціў табе?" Абвешчана было табе, чалавеча, добрае. Чаго ж жадае ад цябе Госпад, як не таго, каб ты чыніў справядлівасьць і любіў міласэрнасьць, і быў заўсёды пакорны перад Богам тваім? Бо Госпад узьвялічыцца ў магутансьці сваёй, і будзе пасьвіць статак свой у супакоі, аж да сканчэньня зямлі. (*4:2-3,5;6:2-5,8*)

**Чытаньне кнігі прарока Ісаі**

Усе сасьмяглыя, прыходзьце да вады; прыходзьце — нават калі ня маеце чым заплаціць, — купляць віно і малако. Бо так кажа Госпад Усемагутны: "Людзі мае, чэрпайце з весялосьцю ваду з крыніцы збаўленьня." І скажаш у той дзень: "Сьпявайце Госпаду, гукайце імя Яго, абвяшчайце сярод усіх народаў славу Яго, успамінайце вялікае імя Яго." Людзі мае, паслухайце Мяне, і будзеце спажываць прысмакі, і душа ваша насыціцца дабром. Прыхіліце вушы вашыя і ідзеце па маім шляху, паслухайце Мяне, і душа ваша жыць будзе ў дабрабыце; і Я дам вам вечны запавет, калі вы паклічаце Мяне і захочаце наблізіцца да Мяне. Няхай нязбожны пакіне свой шлях, і чалавек беззаконны адмовіцца ад сваіх намераў і навернецца да Мяне, і Я зьмілуюся над ім і ачышчу грахі яго. Бо думкі Мае не такія, як думкі вашыя, і шляхі вашыя не такія, як шляхі Мае, — кажа Госпад.— І так як неба вышэй за зямлю, так шлях мой далёкі ад шляху вашага, і думкі вашы ад думак маіх. І так як дождж або сьнег, што зыходзіць з неба на зямлю і не вяртаецца назад, пакуль не напоіць зямлю, ня зробіць яе пладавітаю, і не запэўніць ураджаю, каб прынесьці насеньне сейбіту і хлеб чалавеку: так і слова, што выходзіць з вуснаў Маіх, не вернецца да Мяне бясплодным перш як асягне тое, што Я хацеў, і выканае пасьпяхова сваё пасланство. Дык выходзьце вясёлыя, хай вас вядуць у супакоі: горы і ўзгоркі будуць перад вамі радасна скакаць, і дрэвы польныя махаць галінкамі сваімі. Замест пустазельля вырастуць кіпарысы, замест крапівы — мірт. Будзе гэта на хвалу Гасподнюю, як вечны і незьнішчальны помнік." Так кажа Госпад Усемагутны. (*55:1-3;6-13*)

**Чытаньне кнігі Прыповесьцяў**

Мудрасьць збудавала сабе дом і вычасала сем стаўпоў да яго. Забіла свае ахвяры, зьмяшала віно сваё і прыгатавала стол. Паслала слуг сваіх клікаць моцным голасам на пачастунак, кажучы:"Хто прастадушны, хай прыходзіць да мяне." А тым, што жадалі мудрасьці, казала: "Хадзеце, ешце мой хлеб, піце віно, якое я зьмяшала; пакіньце дурасьць — і будзеце жыць; хадзіце шляхамі разважнасьці." Хто жадае навучаць насьмешніка, накліча на галаву сваю няславу; а хто дакарае грэшніка, сам сабе шкодзіць. Не дакарай насьмешніка, бо ён цябе ўзьненавідзіць. Папраў мудрага і ён цябе любіць будзе. Дай мудраму раду, і ён стане мудрэйшым. Навучы праведніка, і ён пабольшыць веды свае. Пачатак мудрасьці — страх Гасподні; і спазнаваньне Сьвятога — розум. Дзякуючы мне дні твае прадоўжацца, і памножыцца лік гадоў тваіх. (*9:1-11*)

**Вершапесьні**

(*Тон 1*). Калі настала палова дзён Сёмухі, Хрыстос паказаў боскую сілу сваю: Ён ацаліў словам сваім расслабленага і ўзьняў яго з ягонай пасьцелі. Будучы ў людзкім целе, Ён боскім спосабам цуды рабіў і даваў людзям вечнае жыцьцё і багацьце свайго зьмілаваньня .

*Верш.* Успомні народ Твой, які Ты ад пачатку прызначыў для сябе

У палове сьвята, Ты, Мудрасьць Божая, прыйшоў у сьвятыню, дзе навучаў і выкрываў непакорлівых фарысэяў і кніжнікаў, і казаў усім: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да Мяне і п'е жывую ваду, каб ня мець больш смагі давеку; хто верыць у Маю дабрыню, у таго з улоньня пацякуць струмені жыцьця вечнага." Слава велічы дабрыні і спагадлівасьці Тваёй, Хрысьце Божа наш!

*Верш.* Бог — Уладар наш спрадвеку, Ён учыніў збаўленьне пасярод зямлі.

(*Тон 2*). Калі настала палова сьвята, прыйшоў Ісус у сьвятыню і вучыў непакорлівых людзей, кажучы: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да мяне, і п'е ваду жывую вечную, і ён не будзе мець смагі давеку. Рэкі пацякуць з улоньня таго, хто верыць у Мяне, і ён будзе мець сьвятло жыцьця."

Слава ... цяпер....

(*Тон 8*). У палове сьвятых дзён, калі Ты, Збавіцелю, навучаў, юдэі казалі між сабою: "Як гэта Ён ведае пісаньні, не вучыўшыся?" Не разумелі яны, што Ты — Мудрасьць, якою сьвет быў створаны. Слава Табе!

**Адпушчальны трапар**

(*Тон 8*). У палове сьвята сасьмяглую душу маю вадою набожнасьці напаі, Збавіцелю, бо Ты ж некалі сказаў уголас усім: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да Мяне і п'е." Крыніца жыцьця нашага, Хрысьце Божа, слава Табе.

## ЮТРАНЬ

**Трапар**: У палове сьвята...

**Сядальная песьня 1** (*тон 4*). Той, хто ведае думкі сэрцаў усіх, у палове дзён сьвята стаяў у сьвятыні і казаў праўду няпраўдзівым: "Чаму хочаце забіць мяне, Жыцьцядаўцу?" І сьмела

ўсклікнуў: **"Не судзіце, гледзячы на твары, законапраступнікі!"** (*Двойчы*)

**Сядальная песьня** 2 (*тон 5*). Калі надышла палова пачэснае Сёмухі, Уладар усіх, стоячы ў сьвятыні, размаўляў з гэбрэямі. Як Госпад усіх і Бог, Ён яўна выкрываў дзёрзкасьць іхніх сэрцаў. А нам усім у дабрыні сваёй Ён дае веліч зьмілаваньня. (*Двойчы*)

**Канон** (тон 4)

**Песьня** 1. *Ірмас.* Глыбіню Чырвонага мора Ізраіль некалі перайшоў, не замачыўшы ног; і, калі Майсей трымаў крыжападобна рукі, сілу Амалека ў пустыні перамог.

**Песьня** 3. *Ірмас.* Весяліцца ў Табе, Хрысьце, царква Твая, усклікаючы: "Ты мая сіла, Госпадзе, і прыстанішча, і ўмацаваньне."

**Сядальная песьня** (*тон 8*).. Калі настала палова сьвята, Ты, Госпадзе, стаўшы ў сьвятыні, клікаў: "Хто сьмягне, хай прыходзіць да мяне і п'е. Струмені навукі Маёй пацякуць для тых, хто п'е гэтую Маю Боскую ваду; а хто верыць, што Я пасланы праз майго Боскага Айца, будзе праслаўлены разам са Мною." Дзеля гэтага ўсклікаем Табе: "Слава Табе, Хрысьце Божа, бо ты шчодра праліў воды Твайго чалавекалюбства слугам Тваім."

Слава... цяпер...

Ты, Збавіцелю ўсіх, праліваеш сьвету ваду мудрасьці і жыцьця, клічаш усіх зачэрпнуць вады збаўленьня. Чалавек, які прымае ў сябе Боскі закон, гасіць вугольле спакусы і давеку ня будзе смягнуць, і не перастане насычацца стравамі Тваімі, Уладару Госпадзе нябесны. Дзеля гэтага славім дзяржаву Тваю, Хрысьце Божа, і просім даць адпушчэньне правінаў слугам Тваім.

**Песьня** 4. *Ірмас.* Убачыўшы Цябе, Сонца справядлівасьці, узьнесеным на крыжы, Царква, стаўшы з належнай пашанаю, усклікнула: "Слава сіле Тваёй, Госпадзе!"

**Песьня** 5. *Ірмас.* Ты, Госпадзе мой, — сьвятло, што прыйшло на сьвет; Ты — сьвятое сьвятло, якое навяртае з цемры няведаньня тых, што з вераю славяць у песьнях Цябе.

**Песьня** 6. *Ірмас.* "Прынясу Табе, Госпадзе, ахвяру хвалы, — Царква ўсклікае, — ачысьціўшыся ад бесаўскае крыві крывёю, што пацякла з боку Твайго дзеля міласэрнасьці Тваёй."

**Кандак** *(тон 4):* Калі настала палова законнага сьвята, Ты, Творча ўсяго і Ўладару, Хрысьце Божа, сказаў прысутным: "Хадзеце, зачарпніце вады несьмяротнасьці." Таму вось і мы прыходзім да Цябе і даверліва клічам: "Даброты Твае даруй нам, бо Ты — крыніца жыцьця нашага."

*Ікас.* Аледзянелую беззаконнымі правінамі душу маю напаі струменямі крыві Тваёй і зрабі плённай у дабрадзейнасьці. Ты ж сказаў усім прыходзіць да Цябе, Усесьвятое Слова Божае, і чэрпаць жывую ваду нятленнасьці, якая ачышчае грахі тым, што славяць Тваё слаўнае і боскае ўстаньне. Ты, Добры, даеш вучням Тваім, якія вызнаюць Цябе як Бога, сілу Духа, што зыходзіць з вышыні, бо Ты — крыніца жыцьця нашага.

**Песьня 7.** *Ірмас.* У печы хальдэйскай юнакі Абрагамавы, апаленыя любоўю набожнасьці, а ня полымем, усклікалі: "Бласлаўёны Ты ў сьвятыні славы Тваёй, Госпадзе."

**Песьня 8.** *Ірмас.* Распасьцёршы рукі, Даніла заткнуў пашчы львоў; а руплíўцы набожнасьці, юнакі, сілу агню пагасілі. Падперазаўшыся дабрадзейнасьцю, яны клікалі: "Блаславіце Госпада, усе творы Гасподнія!"

*"Больш годную пашаны..." не сьпяваецца*

**Песьня 9.** *Ірмас.* Ад Цябе, Дзева, Гара непарушная, адкалоўся нерукасечны вуглавы Камень — Хрыстос, які злучыў у сабе дзьве прыроды. Дзеля гэтага, радуючыся, Цябе, Багародзіца, узьвялічваем.

Навучыўшыся ад Хрыста жыць па-новаму ў чысьціні, пастараемся захаваць яе да канца, каб сустрэць прыйсце Сьвятога Духа.

Ты, Жыцьцядаймы, пакрыў маю сьмяротную прыроду несьмяротнасьцю, і тленнасьць Ты, Збавіцелю, атуліў ласкаю і ўваскрасіў з сабою, і прывёў да Айца, суняўшы мае дачасныя цярпеньні.

Мы зноў пакліканыя да нябеснага жыцьця заступніцтвам Таго, хто панізіў сябе аж да выгляду слугі, каб нас узьняць. Дзеля гэтага славім Яго.

Слава... цяпер..: Мы пазналі Цябе, Дзева, як корань, крыніцу і прычыну нятленнасьці. Таму ўсе верныя з пашанаю хваляць Цябе, бо Ты нарадзіла нам Хрыста — увасабленьне несьмяротнасьці.

*Катавасія.* Чужое маткам дзявоцтва, нечуванае сярод дзеваў дзетараджэньне: у Табе ж, Багародзіца, абедзьве рэчы сумясьціліся. За тое Цябе ўсе плямёны зямныя няспынна ўзьвялічваюць.

**Экзапатыляр.** У Цябе, Добрасардчны і адзіны Шчодры, невычэрпная чаша дараў; дык дай нам, сасьмяглым, зачарпнуць з яе вады для адпушчэньня грахоў.

**Пахвальныя псалмы**

(*Тон 4*). Мудрасьць і Сіла, Зьзяньне Айца, Слова спрадвечнае і Сын Божы прыйшоў цялесна ў сьвятыню і навучаў жорсткіх і няўдзячных людзей. Яны дзівіліся багацьцю Ягонай мудрасьці і казалі: "Адкуль Ён, нідзе не вучыўшыся, ведае Пісаньні?" (*Двойчы*)

Госпад Мэсыя закрываў вусны кніжнікам, і выкрываў гэбрэяў, кажучы ім: "Не судзіце неправедна і не глядзіце на аблічча, законапраступнікі! Я ў суботу ацаліў расслабленага, бо Я — Госпад суботы і Закону. Чаму хочаце забіць мяне за тое, што Я памёрлых уваскрасіў?"

Няўдзячны і жорсткі народ беззаконны пабіў каменьнем Набутэя, Ісаю расьпілаваў, укінуў у гнойную яму мудрага Ярэму, а Госпада узьнёс на Крыж з крыкам: "Ты, што разбураеш сьвятыню, збаў сябе, і мы паверым."

Слава... цяпер...

Прасьвятліўшыся, браты, уваскрасеньнем Хрыста Збаўцы, і дажыўшы да паловы Гасподняга сьвята, верна захаваем Боскія запаветы, каб нам годна адсьвяткаваць Узьнясеньне і сустрэць прыйсьце Сьвятога Духа.

## ЛІТУРГІЯ

**Трапар** *(Тон 8).* У палове сьвята сасьмяглую душу маю вадою набожнасьці напаі, Збавіцелю, бо Ты ж некалі сказаў уголас усім: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да Мяне і п'е." Крыніца жыцьця нашага, Хрысьце Божа, слава Табе.

Слава ... цяпер ...

**Кандак** *(тон 4):* Калі настала палова законнага сьвята, Ты, Творча ўсяго і Ўладару, Хрысьце Божа, сказаў прысутным: "Хадзеце, зачарпніце вады несьмяротнасьці." Таму вось і мы прыходзім да Цябе і даверліва клічам: "Даброты Твае даруй нам, бо Ты — крыніца жыцьця нашага."

**Пракімен** *(Пс 146:5,1)*. Вялікі Госпад і ўсемагутны, і няма меры розуму Яго.

*Верш.* Слаўце Госпада, бо добра пець хвалу Яму, бо соладка славіць Бога нашага.

**Апостал:** *Дзеяньні* 14:6-18

**Алілуя** *(Пс 73:2,12)*. Успомні народ Твой, які Ты ад пачатку прызначыў для сябе.

*Верш.* Бог — Уладар наш спрадвеку: Ён учыніў збаўленьне пасярод зямлі.

**Евангельле:** Ян 7:14-30

**Задастойнік.** Чужое маткам дзявоцтва, нечуванае сярод дзеваў дзетараджэньне: у Табе ж, Багародзіца, абедзьве рэчы сумясьціліся. За тое Цябе ўсе плямёны зямныя няспынна ўзьвялічваюць.

**Прычасьнік:** "Хто есьць Маё цела і п'е Маю кроў, ува Мне прабывае і Я ў ім," — кажа Госпад. Алілуя, алілуя, алілуя.

## СЕРАДА ПАЛОВЫ СЬВЯТА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

*(Тон 4)*. Разбурыўшы дзяржаву сьмерці, Ты, Хрысьце, сьмерцю Тваёю людзям жыцьцё дараваў, і слаўным уваскрасеньнем у спагадлівасьці Тваёй узьняў род людзкі. Дзеля гэтага пяем Табе песьню хвалы і ўдзячнасьці, сьвяткуючы сьвята трохдзённага сьветлага ўваскрасеньня Твайго, палова якога сёньня мінула, Ісусе Жыцьцядаўча, Збавіцелю душ нашых.

Перад Тваім пачэснынм Крыжам і мукамі, Ты, Хрысьце ўсемагутны, чыніў слаўныя цуды сярод людзей і, як напісана, у палове законнага сьвята стаў і ўсклікнуў, каб усе чулі: "Хто мае смагу, хай прыходзіць свабодна да мяне і чэрпае пітво боскае, ваду жывую. Я даю ўсім ваду жыцьця і сілу мудрасьці, у чалавекалюбстве маім дабравольна ўпадобніўшыся да людзей."

У бязьмежным чалавекалюбстве Тваім, шматміласэрны Хрысьце, перад Тваімі мукамі, калі Ты як Бог захацеў дабравольна пацярпець, Ты паказаў людзям мноства цудаў; і цяпер мяне, які ляжу, зьняможаны і аслаблены правінамі, узьнімі, як некалі расслабленага, і накіруй на шлях боскіх запаветаў Тваіх.

*Тры песьні з мінеі.*

Слава ... цяпер ...

(*Тон 2*). Калі Ты, Хрысьце Божа, прыйшоў у палове сьвята ў сьвятыню, тады Ты навучаў людзей, кажучы: "Хто верыць у Мяне, калі і памрэ, жыць будзе." А гэбрэі з фарысэямі, садукеямі і кніжнікамі, поўныя злосьці, казалі: "Хто гэты блюзьнерца?." Не разумелі яны, што Ты вечна існуеш, роўны славаю Айцу і Духу: Божа наш, слава Табе.

**Вершапесьні**

(*Тон 3*). Мукамі Тваімі, Хрысьце, Ты зацьміў сонца, і зьзяньнем уваскрасеньня Твайго Ты прасьвятліў усё. Прымі нашу малітву, Чалавекалюбча.

Па ўсёй зямлі разышлося ваша навучаньне, сьвятыя апосталы; вы разбурылі ідальскую спакусу багаразумным прапаведаньнем; добры высілак ваш, блаславёныя, дзеля гэтага славім і ўсхваляем вашу памяць.

Мучанікі Твае, Госпадзе, вераю ўмацаваныя, надзеяю падтрымліваныя і зьяднаныя любоўю да Крыжа, мучыцеля ворага зьніштожылі і, атрымаўшы вянцы перамогі, з бесьцялеснымі анёламі моляцца за душы нашы.

Слава ... цяпер ...

(*Тон 3*). У палове сьвята славім Таго, хто ўчыніў збаўленьне пасярод зямлі. Паміж двух злачынцаў Жыцьцё на дрэве вісела, адказваючы маўчаньнем на блюзьнерствы аднаго, а другому, які ўверыў, сказаўшы: "Сёньня яшчэ будзеш са Мною ў раі." Зышоўшы ў магілу, Ён паланіў пекла і ўваскрос на трэці дзень для збаўленьня душ нашых.

**Адпушчальныя трапары.**

*Сьвятога дня*

Слава .... цяпер....

*Сьвята (Тон 8).* У палове сьвята сасьмяглую душу маю вадою набожнасьці напаі, Збавіцелю, бо Ты ж некалі сказаў уголас усім: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да Мяне і п'е." Крыніца жыцьця нашага, Хрысьце Божа, слава Табе.

## ЧАЦЬВЕР ПАЛОВЫ СЬВЯТА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 5*). Вось прыйшла, быццам сьветлы поўдзень, палова сьвята ўваскрасеньня Збавіцеля і прасьвятліла сьвет боскімі ласкамі Хрыстовага ўстаньня, зьзяючы цудамі нятленнасьці, і дзівоснымі знакамі. Яна паказвае нам вышыню ўзьнясеньня, аб'яўляе шматзначнае прыйсьце Духа — сьветлую ўрачыстасьць Сёмухі, — і прыносіць душам нашым веліч зьмілаваньня.

У палове сьвята Госпад дае ўсім струмені добрасардэчнасьці і кліча: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да Мяне і п'е ўдосталь." Як Крыніца спагадлівасьці і Бездань міласэрнасьці, Ён дае сьвету адпушчэньне, абмывае правіны і ачышчае немачы, збаўляе тых, што славяць Ягонае ўваскрасеньне, пакрывае любоўю тых, што шануюць Ягонае слаўнае ўзьнясеньне, і дае душам нашым супакой і веліч зьмілаваньня.

Бог і Госпад стаў сярод сьвятыні — Бог існы, які дзеля нас стаўся чалавекам і бачна зьявіўся ў целе. Ён навучаў усіх словам жыцьця, кажучы: "Ачысьціце, людзі, душы вашыя і жар пажадлівасьцяў астудзіце, каб не застацца вам без пітва. Даю вам Боскую ласку, каб вы сталіся саўдзельнікамі несьмяротнага, лепшага і вышэйшага валадарства, і са Мною праславіліся.

*Тры песьні з мінеі*

Слава ... цяпер...

(*Тон 6*). Сабраўшыся, каб адзначыць сярэдзіну дзён між Тваім, Хрысьце, уваскрасеньнем і прыйсьцем Духа Боскага Твайго, славім у песьнях таямніцу цудаў Тваіх і просім пасляць нам багацьце Твайго зьмілаваньня.

**Вершапесьні**

(*Тон 3*). Дрэва непаслушэнства прарасьціла сьвету сьмерць, а дрэва крыжовае — жыцьцё і нятленасьць. Дзеля гэтага пакланяемся Табе, Хрысьце, што быў расьпяты на ім: хай зазьзяе нам, Госпадзе, сьвятло абліччa Твайго.

Крыжом Тваім, Хрысьце Спасе, сьмерці ўлада зьнішчаная была і зьніштожаныя хітрасьці д'ябальскія, і род людзкі, збаўляючыся верaю, безустанку Цябе ў песьнях славіць.

Вялікая, Госпадзе, сіла крыжа Твайго! Пастаўлены на адным месцы, ён дзейнічае ва ўсім сьвеце, робячы рыбакоў апосталамі і паганаў мучанікамі, якія сёньня моляцца за душы нашы.

Слава ... цяпер ...

(*Тон 8*). У палове сьвята, перад мукамі і слаўным уваскрасеньнем Тваім, Госпадзе, Ты, блаславёны, быў у сьвятыні і навучаў непакорлівых юдэяў, фарысэяў і кніжнікаў, кажучы: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да мяне і п'е, бо рэкі жывой вады Боскага Духа пацякуць з нутра таго, хто верыць у Мяне." Невыказная мудрасьць хвалы Тваёй, Божа наш, які ўсё напаўняеш! Слава Табе!

**Адпушчальныя трапары**: *як у сераду вечарам (гл. с. 8).*

## ПЯТНІЦА ПАЛОВЫ СЬВЯТА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 1*). Творца ўсіх і Жыцьцядаўца, спрадвечнае Слова Айца, прыняўшы дабравольна ад Дзевы цела, стаўся чалавекам, і ў дабрыні сваёй крынічыць невымоўную мудрасьць усім.

Калі настала палова законнага сьвята, Ты, Хрысьце, Уладару Закону, прыйшоў у сьвятыню і навучаў з уладаю людзей, выкрываючы кніжнікаў на аснове пісаньняў, і зьдзіўляючы ўсіх мудрасьцю слоў Тваіх і цудоўнымі знакамі.

Падаўца мудрасьці і ўсяго добрага вылівае Боскія струмені з вечнай крыніцы і кліча: "Прыйдзіце да Мяне ўсе, што маеце смагу, зачарпніце вады, і рэкі боскіх дараваньняў з улоньня вашага пацякуць."

*Тры песьні з мінеі.*

Слава ...

(*Тон 1*). Калі настала палова дзён Сёмухі, Хрыстос паказаў боскую сілу сваю: Ён ацаліў словам сваім расслабленага і ўзьняў яго з ягонай пасьцелі. Будучы ў людзкім целе, Ён боскім спосабам цуды рабіў і даваў людзям вечнае жыцьцё і багацьце свайго зьмілаваньня .

Цяпер...

*Дагматык (тон 3).* Як нам не дзівіцца богачалавечаму мацярынству Твайму, Усячыстая? Ня ведаючы мужа, Ты, бязьвінная, нарадзіла ў целе без Айца Сына — народжанага спрадвеку без маці ад Айца, — які не пацярпеў ніякай зьмены ці разьдзяленьня, але поўнасьцю зьбярог прыкметы абедзьвюх прырод. Дык малі Яго, Дзева Маці ўладарная, каб Ён збавіў душы тых, што прававерна вызнаюць Цябе Багародзіцаю.

**Вершапесьні.**

(*Тон 3*). Крыжом Тваім, Хрысьце Спасе, сьмерці ўлада зьнішчаная была і зьніштожаныя хітрасьці д'ябальскія, і род людзкі, збаўляючыся вераю, безустанку Цябе ў песьнях славіць.

*Верш.* Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу. Апрануўся Госпад у сілу і падперазаўся.

Прасьвятлілася ўсё ўваскрасеньнем Тваім, Госпадзе, і рай быў адчынены, і ўсякае стварэньне безустанку Цябе славіць.

*Верш.* Ён умацаваў сусьвет, што не зварухнецца.

Слаўлю Айца і Сына сілу, і Духа Сьвятога ўладу, пяю хвалу непадзельнаму Боству, Тройцы адзінасутнай, што пануе вечна.

*Верш.* Дому Твайму належыцца сьвятасьць, Госпадзе, праз усе дні.

Мукамі Тваімі, Хрысьце, Ты зацямніў сонца, і зьзяньнем уваскрасеньня Тваіго Ты прасьвятліў усё. Прымі нашу вячэрнюю песьню, Чалавекалюбча.

Слава ... цяпер...

(*Тон 1*). У палове сьвята, Ты, Мудрасьць Божая, прыйшоў у сьвятыню, дзе навучаў і выкрываў непакорлівых фарысэяў і кніжнікаў, і казаў усім: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да Мяне і п'е жывую ваду, каб ня мець больш смагі давеку; хто верыць у Маю дабрыню, у таго з улоньня пацякуць струмені жыцьця вечнага." Слава велічы дабрыні і спагадлівасьці Тваёй, Хрысьце Божа наш!

**Адпушчальны Трапар**

*Сьвята ( тон 8).* У палове сьвята сасьмяглую душу маю вадою набожнасьці напаі, Збавіцелю, бо Ты ж некалі сказаў уголас усім: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да мяне і п'е." Крыніца жыцьця нашага, Хрысьце Божа, слава Табе.

# НЯДЗЕЛЯ САМАРАНКІ

## ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":** *Чатыры песьні нядзельныя 4 тону, тры перапалаўленьня і тры Самаранкі:*

*Перапалаўленьня (Тон 4).* Настала сярэдзіна дзён... Сьён, пачуўшы вестку... Набліжаецца, як напісана, шчодрае выліцьцё Боскага Духа... *(Гл. с. 1)*

*Самаранкі (Тон 1).* У шостай гадзіне Крыніца цудаў прыходзіць да крыніцы, каб улавіць дачку Эвы. Некалі Эва, ашуканая зьмяёю, была выгнаная з раю. А цяпер прыходзіць самаранка зачарпнуць вады. Убачыўшы яе, Збавіцель кажа: "Дай Мне напіцца, і Я напаю цябе вадой жывою." Навучаная, яна вярнулася ў горад і сказала людзям: "Ідзіце пабачыць Хрыста Госпада, Збаўцу душ нашых."

*(Тон 2).* Калі Госпад прыйшоў да студні, самаранка прасіла Добрасардэчнага: "Дай мне напіцца з крыніцы веры, каб мне атрымаць ваду хросту, радасьць і збаўленьне." Жыцьцядаўча Госпадзе, слава Табе!

Спрадвечны і адзінасутны Сын і Слова Бога Айца, Крыніца аздараўленьняў, прыйшоў да крыніцы. Тады з Самарыі прыйшла жанчына зачэрпнуць вады, і Збавіцель кажа ёй: "Дай мне напіцца вады і ідзі пакліч мужа твайго." Яна, жадаючы схаваць праўду ад Бога, быццам ад чалавека, кажа: "Ня маю мужа." Настаўнік жа ёй у адказ: "Праўду сказала ты, што мужа ня маеш. Ты мела пяць мужоў, і той, якога маеш цяпер, ня муж табе." Яна зьдзівілася гэтым словам і пабегла ў горад, голасна расказваючы людзям і кажучы: "Хадзіце пабачыць Хрыста, які дае сьвету багацьце зьмілаваньня."

Слава ...

*(Тон 6).* Каля студні Якуба сустракае Ісус самаранку, і Той, які хмарамі спавівае зямлю, просіць у яе вады. Што за цуд! Той, каго носяць хэрувімы, размаўляе з блудніцай; просіць вады Той, хто над водамі зямлю павесіў; вады шукае Той, хто напаўняе вадою крыніцы і азёры. Ён жадае прыцягнуць да сябе зьняволеную ненавісным ворагам і напаіць жывою вадою тую, якая мучылася грэшнай гарачкаю, як адзіны добрасардэчны і Чалавекалюбны.

Цяпер...

*Дагматык 4 тону*

**Вершапесьні**

(*Тон 4*). Ты, Госпадзе, узышоўшы на крыж, прадзедаў праклён адмяніў і, зышоўшы ў пекла, вечных вязьняў вызваліў і дараваў несьмяротнасьць людзкому роду. Дзеля гэтага ў песьнях славім жыцьцядайнае і збавеннае ўваскрасеньне Тваё.

*Верш*: Хай уваскрэсьне Бог і разьбягуцца ворагі Яго, і хай уцякуць ад Яго ўсе ненавісьнікі Яго.

(*Тон 5*). Пасха сьветлая нам сёньня зьявілася, Пасха новая, сьвятая, Пасха тайная, Пасха ўсяслаўная, Пасха — Хрыстос Збавіцель, Пасха чыстая, Пасха вялікая, Пасха верных, Пасха, што дзьверы райскія нам адчыняе, Пасха — асьвя-чэньне ўсіх верных.

*Верш*: Хай зьнікнуць так, як зьнікае дым, і як тае воск ад агню.

Ідзеце, жанчыны-дабравесьніцы, і, што бачылі, Сыёну скажыце: Прымі ад нас радасную вестку пра ўваскрасеньне Хрыстовае; весяліся, сьвяткуй і радуйся, Ерусаліме, бачачы Ўладара Хрыста, які, быццам жаніх, з магілы выходзіць.

*Верш*: Так хай згінуць грэшнікі ад аблічча Божага, а праведнікі хай узрадуюцца.

Жанчыны-міраносіцы, што прыйшлі на досьвітку да магілы Жыцьцядаўца, знайшлі анёла, які сядзеў на камені, і той абвясьціў ім, кажучы: Чаму шукаеце Жывога сярод мёртвых, чаму плачаце па Несьмяротным, быццам Ён сьмяротны? Ідзеце, занясіце добрую вестку вучням Яго.

*Верш*: Вось дзень, што Госпад стварыў, дзень радасьці і вясельля для ўсіх нас.

Пасха красная, Пасха Гасподняя, Пасха; Пасха ўсяслаўная сёньня зазьзяла нам. Пасха — радасна адзін аднаго абдымем! О, Пасха — вызваленьне ад суму, бо сёньня з магілы, быццам з хораму, зазьзяў Хрыстос, і жанчынаў напоўніў радасьцю, кажучы ім: Нясеце добрую вестку апосталам.

Слава ...

(*Тон 8*). Калі Ты, Хрысьце Божа, у невыказным провідзе Тваім зьявіўся на зямлі, самаранка, пачуўшы слова Тваё, Чалавекалюбча, пакінула ля крыніцы чарпакі і пабегла ў горад сказаць: "Хадзіце пабачыць Сэрцазнаўца: ці часам ня Ён чаканы Хрыстос, што мае багацьце міласэрнасьці."

Цяпер ...

Уваскрасеньня дзень! Прасьветлімся ўрачыстасьцю і адзін аднаго абдымем; скажам "Браты" і тым, што ненавідзяць нас, прабачыўшы ўсё дзеля ўваскрасеньня; і ўсклікнем вось так:

Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў і тым, што ў магілах, жыцьцё дараваў.

**Адпушчальныя трапары**

*Уваскрэсны (Тон 4).* Сьветлую вестку аб уваскрасеньні і аб адмене прадзедаўскага асуджэньня ад анёла пачуўшы, Госпаднія вучаніцы апосталам з радасьцю сказалі: "Сьмерць пераможаная, Госпад Бог уваскрос, даючы сьвету багацьце свайго зьмілаваньня."

Слава... цяпер...

*Паловы сьвята (Тон 8).* У палове сьвята сасьмяглую душу маю вадою набожнасьці напаі, Збавіцелю, бо Ты ж некалі сказаў уголас усім:"Хто мае смагу, хай прыходзіць да Мяне і п'е." Крыніца жыцьця нашага, Хрысьце Божа, слава Табе.

**ЮТРАНЬ**

*Трапары як на вячэрні. Служба нядзельная 4 тону. Евангельле ранішняе нядзельнае 7. Каноны вялікодны і самаранкі.*

**Канон велікодны** *(тон 1)*

**Песьня 1.** *Ірмас.* Уваскрасеньня дзень! Радуйцеся, людзі: сёньня Пасха Госпадняя, Пасха! Бо вось ад сьмерці да жыцьця і ад зямлі на неба Хрыстос Бог узьняў нас, якія пяём песьню перамогі.

Ачысьцім нашыя пачуцьці, каб нам убачыць Хрыста ў невымоўным зьзяньні ўваскрасеньня, і пачуць, як Ён кажа: Радуйцеся ўсе, што пяеце песьню перамогі.

Нябёсы хай дастойна весяляцца, і хай радуецца зямля, хай увесь сьвет, бачны і нябачны, сьвяткуе, бо ўваскрос Хрыстос, наша радасьць вечная.

**Песьня 3.** *Ірмас.* Хадзеце, будзем піць пітво новае, не з каменя бясплоднага цудам атрыманае, але тое, што б'е жывой крыніцай з магілы Хрыста, які нас умацоўвае.

Сёньня мы напоўніліся сьвятлом — неба, зямля і апраметная. Хай усё стварэньне сьвяткуе ўваскрасеньне Хрыста, які нас умацоўвае.

Учора я быў пахаваны з Табою, Хрысьце — сёньня Ты ўваскрос і я ўстаў; учора я быў укрыжаваны з Табою — услаў мяне сёньня ў валадарстве Тваім.

**Кандак Велікодны** *(тон 8)*: Хоць Ты, Несьмяротны, і зышоў у магілу, Ты зьнішчыў пекла ўладу і ўваскрос пераможна, Хрысьце Божа, жанчынам міраносіцам кажучы "Радуйцеся", і Тваім апосталам супакой даруючы, Ты, што даеш памёрлым уваскрасеньне.

*Ікас.* Устаўшы да сьвітаньня, жанчыны выйшлі шукаць, быццам дня, Сонца, што было раней за сонца і зайшло ў магілу, і казалі адна адной: "Хадзем, сяброўкі, памажам духмянымі алейкамі ў магіле жыцьцядайнае цела Таго, хто ўваскрасіў памёрлага Адама; пойдзем хутка і, як некалі мудрацы, прынясем у дар духмянае міра Таму, хто ляжыць, спавіты не ў пялёны, але ў пахавальнае палатно; заплачам і ўсклікнем: Устань, Уладару, Ты, што даеш памёрлым уваскрасеньне!"

**Кандак і ікас Паловы сьвята** . Калі настал апалова законнага сьвята... *і г. д. (Г.т. с. 5)*

**Сядальная песьня самаранкі** (*Тон 4*)). Хай радуецца неба, хай цешыцца зямля, бо Хрыстос нарадзіўся як чалавек ад Дзевы і сьмерцю сваёю выбавіў род людзкі ад тленнасьці, і зазьзяў цудамі. Жанчыне самаранцы, што прасіла вады, Ён, адзіны несьмяротны, крынічыць аздараўленьне.

Слава... цяпер...

Мудрасьці Падаўча і Уладару, у часе законнага сьвята, Ты сядзеў у сьвятыні і навучаў усіх, кажчы: "Прыходзьце ўсе , хто мае смагу, піце ваду, якую Я даю, і пакаштуйце слодычы Боскага жыцьця."

**Песьня 4.** *Ірмас.* На боскай варце Богам натхнёны Авакум хай стане разам з намі і пакажа анёла прамяністага, які нам кажа: Сёньня збаўленьне сьвету, бо ўваскрос Хрыстос усемагутны.

Хрыстос уваскрос з мёртвых!

Хрыстос зьявіўся нам, як сьмяротны чалавек, з дзяво-чага ўлоньня; Ён наша Пасха, што, як ягнё бязьвіннае, граху ня ведае; як Бог праўдзівы, Ён дасканалы.

Быццам аднагадовае ягнятка, Хрыстос — наш блаславёны вянец і Пасха ачышчальная — быў дабравольна прынесены ў ахвяру за ўсіх, і вось з магілы зазьзяла нам Сонца справядлівасьці.

Богаайцец Давід радасна танцаваў перад каўчэгам Запавету, што быў правобразам; мы ж, сьвяты народ Божы і сьведкі зьдзейсьненага, радуемся ў Богу, бо ўваскрос Хрыстос усемагутны.

**Песьня 5.** *Ірмас.* Устанем рана да сьвітаньня і, замест духмянасьцяў, песьню Ўладару прынясем, і ўбачым Хрыста, Сонца справядлівасьці, што асьвятляе ўсім жыцьцё.

Убачыўшы бязьмежную міласэрнасьць Тваю, Хрысьце, усе, зьвязаныя путамі пякельнымі, вясёлымі крокамі пасьпяшылі да сьвятла і ўславілі Пасху вечную.

Са сьвечкамі ў руках выйдзем насустрач Хрысту, які, быццам жаніх, з магілы выходзіць, і разам са сьвяточным натоўпам уславім Пасху Божую, збавенную.

**Песьня 6.** *Ірмас.* Ты, Хрысьце, зышоў ў глыбіні падзем-ныя і разьбіў вечныя путы, што трымалі вязьняў, і на трэці дзень, быццам Ёна з нутра кіта, устаў з магілы.

Захаваўшы цэлымі пячаці, Ты, Хрысьце, што не пару-шыў дзявоцтва нараджэньнем Тваім, уваскрос з магілы і адчыніў нам райскія вароты.

Спасе мой, жывая і несьмяротная ахвяра, Ты як Бог дабравольна прынёс сябе ў ахвяру Айцу і, уваскросшы з магілы, узьняў з сабою праайца Адама і ўвесь род людзкі.

**Кандак самаранкі** *(тон 8).* Прыйшоўшы з верай да студні, самаранка ўбачыла Цябе, мудрасьці Крыніцу, *і напіўшыся з яе* ўдосталь, атрымала ў спадчыну вечнае валадарства і непрамінальную славу.

*Ікас.* Навучымся чыстае тайны, пра якую Ян піша, што здарылася ў Самарыі: як Госпад размаўляў з жанчынаю і прасіў вады Той, хто сабраў усе воды ў адно, аднапасадны з Айцом і Духам, што прыйшоў, каб знайсьці заняпалы вобраз свой, вечна і заўсёды Слаўны.

**Песьня 7.** *Ірмас.* Той, хто выбавіў юнакоў з агню, стаў-шыся чалавекам, церпіць, як сьмяротны, і цярпеньнем сваім сьмяротнае апранае ў красу несьмяротнасьці — адзіны найблаславёны Бог Айцоў і ўсемагутны.

Багамудрыя жанчыны-міраносіцы з духмянымі алей-камі пасьпяшылі сьледам за Табою і, шукаючы са сьлязьмі памёрлага,

радасна пакланіліся Богу, і Пасху тайную вучням Тваім, Хрысьце, абвясьцілі.

Сьвяткуем сьмерці сьмерць, пекла зьнішчэньне і новага, вечнага жыцьця пачатак і, радуючыся, славім Прычыну ўсяго, што здарылася, адзінага благаслаўлёнага Бога Айцоў і ўсяслаўнага.

Сапраўды сьвятая і ўрачыстая гэтая збавенная ноч, і прамяністая прадвесьніца сьветлага дня ўваскрасеньня, у які Спрадвечнае Сьвятло цялесна ўсім з магілы зазьзяла.

**Песьня 8.** *Ірмас.* Гэты асаблівы і сьвяты дзень, адзіны з усіх суботаў, уладарны і гасподні, сьвята над сьвятамі і ўрачыстасьць над урачыстасьцямі: у гэты дзень благаслаўляем Хрыста на ўсе вякі.

Хадзіце, у гэты ўрачысты дзень Уваскрасеньня, пакаш-туем новага плоду вінаграднага, радасьці Божай і вала-дарства Хрыстовага і ўславім Яго на ўсе вякі.

Глянь навокал, Сыёне, і бач: вось прыйшлі да цябе, быццам боскія сьветачы, з захаду і поўначы, з поўдня і ўсходу дзеці твае, благаслаўляючы Хрыста на ўсе вякі.

Усесьвятая Тройца, Божа наш, слава Табе!

Ойча ўсемагутны, і Сыне, і Духу, адзіная ў трох асобах існасьць, надпрыродная і найвышэйшая Боскасьць, у Цябе мы ахрысьціліся і Цябе благаслаўляем на ўсе вякі.

*"Больш годную пашаны за хэрувімаў..." не сьпяваецца.*

**Песьня 9.** *Ірмас.* Сьвяціся, сьвяціся, Новы Ерусаліме, бо слава Гасподняя зазьзяла над табой. Радуйся сёньня і весяліся, Сыёне. Ты ж, Чыстая, красуйся, Багародзіца, бо Той, каго Ты нарадзіла, з мёртвых устаў.

О Боскае, о любае, о найсьвятое слова Тваё: Ты, Хрысьце, абяцаў быць з намі да канца сьвету. Мы ж, што жывем з гэтай надзеяю, радуемся.

Ты, Хрысьце, наша вялікая і сьвятая Пасха, Слова Божае, Мудрасьць і Сіла. Дай нам больш дасканала зьяднацца з Табою ў незаходны дзень валадарства Твайго.

Анёл усклікнуў Поўнай ласкі: Чыстая Дзева, радуйся! І зноў кажу: Радуйся, бо Твой Сын уваскрос на трэці дзень з магілы і мёртвых узьняў з сабою. Людзі, весяліцеся!

*Канон самаранкі (тон 4). Ірмас.* Бог Ізраіля паказаў моц правіцы сваёй, скінуў магутных з пасаду і ўзьнёс пакорных. Сьвітанак з вышыняў наведаў нас і накіраваў нас на шлях міру.

Сёньня Жыцьцё ўсіх, Хрыстос, павешаны дабравольна на дрэве. Убачыўшы гэта, зямля затрэслася, і шмат памёрлых сьвятых устала, і пякельная вязьніца пахіснулася.

Ты, Хрысьце, выйшаў з магілы ва ўсёй красе сваёй, быццам жаніх з вясельнага хораму, і разбурыў няволю, скрышыў брамы пекла сілаю Боскаю і духоўным зьзяньнем устаньня Твайго прасьвятліў сьвет.

Складзем сёньня духоўны хор, каб засьпяваць "Госпад уваскрос!" Хай радуецца зямля, неба хай весяліцца, хай хмары дадуць дождж праведнасьці нам, якія сьветла сьвяткуем і ўзьвялічваем Хрыста.

Госпад — жыцьцё жывых і крыніца дабра, шчодра точыць ваду навучаньня свайго і кажа жанчыне: "Дай мне напіцца вады, каб мне даць табе ваду, што сушыць крыніцы грахоў тваіх."

Слава...: Сьвятло адзінае непадзельнае, трохсонечную Еднасьць, беспачатнага Айца, Сына і Духа, адзінае Боства, жыцьцё і Творцу ўсіх тройчы сьвятымі песьнямі разам з бесьцялеснымі сіламі праслаўляем .

Цяпер...: Прасьвятлі, Чыстая, што сталася жыльлём Сьвятла, зрэнкі сэрца майго, азмрочаныя подступамі ворага, і зрабі мяне годным бачыць чыстым сэрцам Сьвятло, што, вышэй за ўсякі розум, зазьзяла ад Цябе.

*Катавасія.* Сьвяціся, сьвяціся, Новы Ерусаліме, бо слава Гасподняя зазьзяла над табой. Радуйся сёньня і весяліся, Сыёне. Ты ж, Чыстая, красуйся, Багародзіца, бо Той, каго Ты нарадзіла, з мёртвых устаў.

Екзапастыляр. Целам заснуўшы як мёртвы, Уладару і Госпадзе, на трэці дзень Ты ўваскрос і Адама ад тленнасьці ўзьняў, перамогшы сьмерць. Пасха нятленная, сьвету збаўленьне!

Слава...: Ты, Усемагутны Спасе, які гэбрэям з нясечанага каменя ваду дастаў, прыйшоў у Самарыю і, сустрэўшы жанчыну, папрасіў у яе напіцца вады. Ты прывёў яе да веры, і цяпер яна цешыцца ў небе вечным жыцьцём.

Цяпер...: У палове сьвята Ты, Чалавекалюбча, прыйшоў у сьвятыню і казаў: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да мяне і чэрпае ваду жывую, у якой знойдзе радасьць, ласку і жыцьцё несьмяротнае."

**Пахвальныя псалмы**

*Шэсьць нядзельных песьняў 4 тону, і наступныя самаранкі:*

*Верш.* Падрыхтуйся і ідзі ўперад пераможна дзеля праўды, набожнасьці і справядлівасьці.

(*Тон 3*). Хай сёньня сьветла цешыцца неба і зямля, бо Хрыстос, каб збавіць Адама ад першага праклёну, зьявіўся ў целе як чалавек і праславіўся цудамі. Ён прыйшоў у Самарыю і размаўляў з жанчынаю. Той, хто поіць хмары вадою, прасіў у яе вады. Дык паклонімся ўсе Таму, хто дабрасардэчным рашэньнем сваім стаўся ўбогім дзеля нас.

*Верш.* Ты палюбіў праўду і ўзьненавідзеў беззаконьне.

(*Тон 6*). Сказаў Госпад самаранцы: "Калі б ты ведала дар Божы і хто гэта просіць цябе «Дай мне напіцца вады», то ты б сама прасіла ў яго, і Ён даў бы табе напіцца, каб ты ня мела смагі давеку."

Слава...: *(Тон 6)*. Жыцьцядайная Крыніца, Ісус Збаўца наш прыйшоў да крыніцы патрыярха Якуба і прасіў ў жанчыны самаранкі даць напіцца вады. Калі ж яна сказала, што гэта нязвычна ў юдэяў, мудры Творца ласкавымі словамі навёў яе на тое, каб яна прасіла ў Яго вады вечнае. Атрымаўшы, яна пайшла абвясьціць усім, кажучы: "Хадзеце і гляньце на Таго, хто знае ўсё тайнае — Бога, які прыйшоў у целе, каб збавіць чалавека."

Цяпер...: Найблаславёная Ты...

ЛІТУРГІЯ

**Трапар нядзельны** *(тон 4)*. Сьветлую весьць аб уваскрасеньні і аб адмене прадзедаўскага асуджэньня ад анёла пачуўшы, Гасподнія вучаніцы апосталам з радасьцю сказалі: "Сьмерць пераможаная, Госпад Бог уваскрос, даючы сьвету багацьце свайго зьмілаваньня."

**Трапар Перапалаўленьня** *(Тон 8)*. У палове сьвята сасмяглую душу маю вадою набожнасьці напаі, Збавіцелю, бо Ты ж некалі сказаў уголас усім: "Хто мае смагу, хай прыходзіць да Мяне і п'е." Крыніца жыцьця нашага, Хрысьце Божа, слава Табе.

Слава...

**Кандак Самаранкі** *(тон 8).* Прыйшоўшы з вераю да студні, самаранка ўбачыла Цябе, мудрасьці Крыніцу, і напіўшыся з яе ўдосталь, атрымала ў спадчыну вечнае валадарства і непамінальную славу.

Цяпер...

**Кандак Паловы сьвята** *(тон 4).* Калі настала палова законнага сьвята, Ты, Творча ўсяго і Ўладару, Хрысьце Божа, сказаў прысутным: "Хадзеце, зачарпніце вады несьмяротнасьці." Таму вось і мы прыходзім да Цябе і даверліва клічам: "Даброты Твае даруй нам, бо Ты — крыніца жыцьця нашага."

**Пракімен** *(Пс. 46:7,2).* Сьпявайце Богу нашаму, сьпявайце: сьпявайце Уладару нашаму, сьпявайце.

*Верш.* Усе народы, пляскайце ў далоні, усклікніце Госпаду радасным голасам.

**Апостал:** Дзеяньні 11:19-30

**Алілуя** *(Пс. 44:5,8).* Падрыхтуйся і ідзі ўперад пераможна дзеля праўды, набожнасьці і справядлівасьці.

*Верш.* Ты палюбіў праўду і ўзьненавідзеў беззаконьне.

**Евангельле :** Ян 4:5-42

**Задастойнік:** Анёл усклікнуў Поўнай ласкі: Чыстая Дзева, радуйся! І зноў кажу "Радуйся", бо твой Сын уваскрос на трэці дзень з магілы і мёртвых узьняў з сабою. Людзі, весяліцеся.

Сьвяціся, сьвяціся, новы Ерусаліме, бо слава Гасподняя зазьзяла над табой. Радуйся сёньня і весяліся, Сыёне! Ты ж, Чыстая, красуйся, Багародзіца, бо Той, каго ты нарадзіла, з мёртвых устаў.

**Прычасьнік.** Хваліце Госпада з нябёсаў, хваліце Яго на вышынях. Алілуя, алілуя, алілуя.

## НЯДЗЕЛЯ САМАРАНКІ ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 5*). Вось прыйшла, быццам сьветлы поўдзень...; **У палове** сьвята...; Бог і Госпад стаў у сьвятыні... *(Гл Чацьвер **паловы сьвята** ўвечары, с.9)*

*Тры песьні з мінеі.*

Слава ... цяпер...

(*Тон 9*). У палове **сьвята, перад мукамі і слаўным уваскрасеньнем** Тваім... *(Гл. **Чацьвер паловы сьвята, с.10**)*

**Вершапесьні**

(*Тон 4*). Жыцьцядайнаму Крыжу Твайму безустанку пакланяемся, Хрысьце Божа, і славім трохдзённае ўваскрасеньне, якім Ты, усясільны, абнавіў людзкую прыроду і, як добры і Чалавекалюбец, адчыніў зноў да неба ўваход.

Я жадаў сьлязьмі змыць сьляды правінаў маіх, Госпадзе, каб у далейшым жыцьці дагадзіць Табе пакаяньнем, але вораг спакушае мяне і змагаецца з душою маёю. Госпадзе, перш чым прыйдзе канец, ня дай мне згінуць, але збаў мяне.

Хрысьце Божа, праслаўлены памяцьцю сьвятых Тваіх, малітвамі іх пашлі нам веліч зьмілаваньня Твайго.

Слава... цяпер...

(*Тон 6*). Сабраўшыся, каб адзначыць сярэдзіну дзён між Тваім, Хрысьце, уваскрасеньнем і прыйсьцем Духа Боскага Твайго, славім у песьнях таямніцу цудаў Тваіх і просім пасладь нам багацьце Твайго зьмілаваньня.

**Адпушчальныя трапары**

***Адпушчальны трапар сьвятога дня.***

Слава ... цяпер...

***Трапар сьвята** (тон 8).* У палове сьвята... (*Гл. с.29*)

## ПАНЯДЗЕЛАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу....":**

(*Тон 1*). Творца ўсіх і Жыцьцядаўца...; Калі настала палова законнага сьвята...; Падаўца мудрасьці і ўсяго добрага... *(Гл. Пятніцу паловы сьвята ўвечары, с.10)*

*Тры песьні з мінеі.*

Слава ... цяпер ...

(*Тон 2*). Калі Ты, Хрысьце Божа, прыйшоў у палове сьвята ў сьвятыню, тады Ты навучаў людзей, кажучы: "Хто верыць у Мяне, калі і памрэ, жыць будзе." А гэбрэі з фарысэямі, садукеямі і кніжнікамі, поўныя злосьці, казалі: "Хто гэты блюзьнерца?." Не разумелі яны, што Ты вечна існуеш, роўны славаю Айцу і Духу: Божа наш, слава Табе.

**Вершапесьні**

(*Тон 4*). Будучы дабравольна прыбітым да крыжовага дрэва, Ты, Збавіцелю, забарону дрэва непаслушэнства адмяніў і, зышоўшы да пекла, як усемагутны Бог, путы сьмерці разарваў. Дзеля гэтага пакланяемся Твайму трохдзённаму ўваскрасеньню і радасна клічам: "Усемагутны Госпадзе, слава Табе!"

Хто, Госпадзе, трапіўшы ў буру, не выратуецца, прыбегшы да Твайго прыстанішча? Або хто, занядужаўшы, не выздаравее, пакаштаваўшы Тваіх лекаў? Госпадзе, Творча ўсяго і лекару нядужых, перш чым мне зусім згінуць, збаў мяне.

Ты, што прымаеш цярпеньні мучанікаў сьвятых, і ад нас прымі, Чалавекалюбча, песьню хвалы, і малітвамі іх даруй нам веліч зьмілаваньня Твайго.

Слава ... цяпер ...

(*Тон 3*). У палове сьвята славім Таго, хто ўчыніў збаўленьне пасярод зямлі. Паміж двух злачынцаў Жыцьцё на дрэве вісела, адказваючы маўчаньнем на блюзьнерствы аднаго, а другому, які ўверыў, сказаўшы: "Сёньня яшчэ будзеш са Мною ў раі." Зышоўшы ў магілу, Ён паланіў пекла і ўваскрос на трэці дзень для збаўленьня душ нашых.

**Трапары адпушчальныя:** *як у нядзелю вечарам* *( гл. с. 22)*

## АЎТОРАК УВЕЧАРЫ

### АДДАНЬНЕ ПАЛОВЫ СЬВЯТА

***Усё, як у дзень*** *сьвята, апрача чытаньняў* *(гл. с. 1)*

## СЕРАДА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 4*). Хрыстос сустрэў ля студні самаранку і, жадаючы ейнага навярненьня і збаўленьня, папрасіў у яе піць. Пакуль яна

даставала ваду, Ён сам дастаў жывое пітво і напаіў яе ім. І яна пайшла расказаць суседзям: "Мэсія Хрыстос, пра якога гаворыць Закон, зьявіўся як чалавек: самыя запаветныя думкі вядомыя Яму."

"Мэсія Хрыстос, аб якім напісана, зьявіўся на зямлі — самаранка сказала жыхарам гораду. — Ён сказаў мне ўсё, што я ўчыніла, і адгадаў самыя запаветныя тайны сэрца майго." Увесь горад, сышоўшыся, упэўніўся ў праўдзе слоў яе, і паверыў бачанаму.

Некалі Эва бачыла Цябе, Госпадзе Божа, калі Ты хадзіў па раі ў поўдзень; а цяпер дачка яе ўбачыла зноў Цябе, калі Ты ў поўдзень сядзеў ля крыніцы, дзе была выкапаная студня, і прасіў у яе піць, хочучы вадою вечнага жыцьця напаіць яе, што і сталася. Напіўшыся ўдосталь Твае жыцьцядайнае вады, яна ў горадзе прапаведавала багацьце ласкі.

*Тры песьні з мінеі.*

Слава ... цяпер...

(*Тон 1*). У шостай гадзіне Крыніца цудаў прыходзіць да крыніцы, каб улавіць дачку Эвы. Некалі Эва, ашуканая зьмяёю, была выгнаная з раю. А цяпер прыходзіць самаранка зачарпнуць вады. Убачыўшы яе, Збавіцель кажа: "Дай Мне напіцца, і Я напаю цябе вадой жывою." Навучаная, яна вярнулася ў горад і сказала людзям: "Ідзіце пабачыць Хрыста Госпада, Збаўцу душ нашых."

**Вершапесьні**

(*Тон 4*). Ты, Госпадзе, разьбіў вароты пекла і сьмерцю Тваёю зьнішчыў сьмерці ўладу, і род людзкі ад тленнасьці выбавіў, даючы сьвету жыцьцё і нятленнасьць, і багацьце зьмілаваньня Твайго.

Ты, Хрысьце, прасьвятліў апостальскі хор Духам Сьвятым. Малітвамі іх ачысьці нашую брыдоту грахоўную.

Маючы сьмеласьць у Збавіцеля, маліце няспынна Яго, сьвятыя, за нас грэшных, каб Ён даў нам адпушчэньне грахоў і душам нашым веліч зьмілаваньня.

Слава ... цяпер...

(*Тон 2*). Калі Госпад прыйшоў да студні, самаранка прасіла Добрасардэчнага: "Дай мне напіцца з крыніцы веры, каб мне

атрымаць ваду хросту, радасьць і збаўленьне." Жыцьцядаўча Госпадзе, слава Табе!

**Трапары адпушчальныя**

*Трапар сьвятога дня*

Слава ... цяпер ...

*Трапар нядзельны (тон 4).* Сьветлую вестку аб уваскрасеньні і аб адмене прадзедаўскага асуджэньня ад анёла пачуўшы, Гасподнія вучаніцы апосталам з радасьцю сказалі: "Сьмерць пераможаная, Госпад Бог уваскрос, даючы сьвету багацьце свайго зьмілаваньня."

**Увага.** *На літургіі ў чацьвер і аж да канца Вялікадня сьпяваецца канчальны кандак Вялікодны "Хоць Ты, Несьмяротны і зышоў у магілу..." (Гл. с. 32) і задастойнік "Анёл усклікнуў Поўнай ласкі..." (Гл. с. 33).*

## ЧАЦЬВЕР УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 4*). "Ідзеце і гляньце на Ісуса Мэсію, пра якога Майсей пісаў, і якому трэба згодна з законам прыйсьці: вось Ён у вялікай добрасардэчнасьці зьявіўся на зямлі і са мной ля студні як чалавек размаўляў; сапраўды Ён — Хрыстос, які прыйшоў на сьвет," — Самаранка казала жыхарам Сыхару.

Жыхары гораду напіліся, быццам салодкай вады, слковаў, што цяклі з вуснаў жанчыны, і пайшлі хутка да студні, з якой цякла шчодра вада, каб бачыць Крыніцу вечную, што асьвяжае змарнелыя душы.

Убачыўшы Крыніцу ў вобразе чалавека, жыхары гораду сказалі жанчыне: "Цяпер ужо верым не дзякуючы словам Тваім. Мы самі пазналі, што Ён — Збаўленьне і Вызваленьне вечнае сьвету."

*Тры песьні з мінеі.*

Слава ... цяпер ...

(*Тон 6*). Каля студні Якуба сустракае Ісус самаранку, і Той, які хмарамі спавівае зямлю, просіць у яе вады. Што за цуд! Той, каго носяць хэрувімы, размаўляе з блудніцай; просіць вады Той, хто над водамі зямлю павесіў; вады шукае Той, хто напаўняе вадою крыніцы і азёры. Ён жадае прыцягнуць да сябе зьняволеную

ненавісным ворагам і напаіць жывою вадою тую, якая мучылася грэшнай гарачкаю, як адзіны добрасардэчны і Чалавекалюбны.

**Вершапесьні**

(*Тон 4*). Маючы заўжды на дапамогу крыж Твой, Хрысьце, мы лёгка нішчым варожыя сеці.

Ты, Госпадзе, узышоўшы на крыж, прадзедаў праклён адмяніў і, зышоўшы да пекла, вечных вязьняў вызваліў і дараваў несьмяротнасьць людзкому роду. Дзеля гэтага ў песьнях славім жыцьцядайнае і збавеннае ўваскрасеньне Тваё.

Адухоўленыя ахвяры, цэлапаленьні духоўныя, мучанікі Гасподнія, дасканалыя Божыя ахвярапрынашэньні, Богу ведамыя авечкі, што Бога знаюць і загарадзь якіх недаступная ваўкам: маліцеся, каб нам разам з вамі на ціхіх водах знайсьці супакаеньне.

Слава ... цяпер ...

(*Тон 6*). Госпад кажа самаранцы: "Калі б ты ведала, што такое дар Божы і хто той, што просіць у цябе напіцца вады, ты б сама прасіла ў яго і ён даў бы табе піць, каб ты не мела смагі давеку."

**Адпушчальныя трапары**: *як у сераду вечарам (гл. с. 25)*

## ПЯТНІЦА ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу....":**

(*Тон 1*). У шостай гадзіне... ; Калі Госпад прыйшоў...; Спрадвечны і адзінасутны Сын і Слова Бога Айца... *(гл. с. 12)*

*Тры песьні з мінеі*

Слава ...: (*Тон 6*). Каля студні Якуба сустракае Ісус самаранку... *(гл. с. 12)*

Цяпер ...

***Дагматык*** *(тон 4)*. Прарок Давід, які дзякуючы Табе стаўся богаайцом, у песьні Таму, хто вялікія рэчы для Цябе ўчыніў, так пра цябе прадказаў: "Каралева стала па паравай руцэ тваёй." Ён паказаў Цябе, як хадайніцу і Маці Жыцьця, бо ад Цябе захацеў прыняць цела і стацца чалавекам Хрыстос Бог, жадаючы аднавіць сатлелы прагнасьцю вобраз свой і знайсьці заблудную ў горных пропасьцях авечку, каб, узяўшы яе на плечы, прынесьці да Айца і

даць ёй месца разам з нябеснымі сіламі, і **збавіць, Багародзіца,** сьвет у велічы і багацьці міласэрнасьці сваёй.

**Вершапесьні**

(*Тон 4*). Жыцьцядайнаму крыжу Твайму безустанку пакланяемся, Хрысьце Божа, і славім трохдзённае ўваскрасеньне Тваё, якім Ты, усясільны, абнавіў людзкую прыроду і, як добры і Чалавекалюбец, адчыніў зноў да неба ўваход.

*Верш.* Госпад пануе, Ён апрануўся ў красу. Апрануўся Госпад у сілу і падперазаўся

Будучы прыбітым дабравольна да дрэва Крыжовага, Ты, Збавіцелю, адмяніў праклён дрэва непаслушэнства, і зышоўшы ў пекла, як Усемагутны, путы сьмяротныя разарваў. Дзеля гэтага пакаланяемся Твайму ўваскрасеньню з мёртвых, клічучы радасна: "Усемагутны Госпадзе, слава Табе!"

*Верш.* Ён умацаваў сусьвет, што не зварухнецца

Ты, Хрысьце, разбурыў медныя вароты, і сьмерцю Тваёю зьнішчыў сьмерці ўладарства, і вызваліў род людзкі ад тленнасьці, даючы сьвету жыцьцё і нятленнасьць, і веліч зьмілаваньня.

*Верш.* Дому Твайму належыцца сьвятасьць, Госпадзе, праз усе дні.

Ты, Госпадзе, узышоўшы на крыж, прадзедаў праклён адмяніў і, зышоўшы да пекла, вечных вязьняў вызваліў і дараваў несьмяротнасьць людзкому роду. Дзеля гэтага ў песьнях славім жыцьцядайнае і збаўеннае ўваскрасеньне Тваё.

Слава... цяпер...

(*Тон 8*). Калі Ты , Хрысьце Божа, у невыказным провідзе Тваім зьявіўся на зямлі, самаранка, пачуўшы слова Тваё, Чалавекалюбча, пакінула ля крыніцы чарпакі і пабегла ў горад сказаць: "Хадзіце пабачыць Сэрцазнаўцу: ці часам ня Ён чаканы Хрыстос, які мае багацьце міласэрнасьці."

**Адпушчальныя трапары:** ***як у сераду вечарам (гл. с. 25)***

## НЯДЗЕЛЯ СЬЛЕПАНАРОДЖАНАГА

### ВЯЧЭРНЯ

**На "Госпадзе, Цябе клічу"**: *песьні нядзельныя 5 тону, пасьля наступныя:*

(*Тон 2*). Сьлепанароджаны, думаючы ў сабе, казаў: "Ці не за грэх бацькоў маіх нарадзіўся я без вачэй? А можа за няверства людзей — як перасьцярога, — я такі? Ня ведаю, калі ноч, а калі дзень, і не магу ўстаяць на нагах маіх, спатыкаючыся аб каменьне. Ня бачыў я сонечнага сьвятла, ані вобразу Тварца майго. Дык малюся Табе, Хрысьце Божа: Глянь на мяне спагадліва і зьлітуйся нада мною." (*Двойчы*)

Ідучы са сьвятыні, Ісус сустрэў чалавека сьляпога ад нараджэньня і, зьлітаваўшыся над ім, памазаў вочы ягоныя гразьзю і сказаў: "Ідзі, памыйся ў Сілааме." Ён, памыўшыся, пачаў бачыць, і аддаў славу Богу. Ягоныя ж суседзі пыталіся ў яго: "Хто адчыніў табе зрэнкі, якіх ніхто аздаравіць ня мог?." А ён усклікнуў: "Чалавек на імя Ісус сказаў мне: Памыйся ў Сілааме, і я пачаў бачыць. Гэта сапраўды Той, пра якога Майсей сказаў у Законе, што Ён Хрыстос-Мэсыя і Збавіцель душ нашых."

Слава ...

(*Тон 5*). Ідучы дарогаю, Ты, Госпадзе, сустрэў сьлепанароджанага чалавека. Вучні, зьдзіўленыя, пыталіся ў Цябе: "Настаўнік, хто зграшыў — ён ці бацькі ягоныя, — што сьляпым нарадзіўся?" А Ты, Збавіцелю мой, адказаў ім: "Ні ён, ані бацькі яго не зграшылі, але каб сіла Божая аб'явілся на ім. Мне трэба рабіць справу Таго, хто паслаў мяне, учынкі, якіх ніхто іншы ня можа рабіць." Сказаўшы гэта, Ён плюнуў на зямлю і, зьмяшаўшы гразь, памазаў вочы сьляпому і сказаў: "Ідзі і памыйся ў Сілаамскай сажалцы." І ён, памыўшыся, выздаравеў і ўсклікнуў "Веру, Госпадзе!" і пакланіўся Табе. Дзеля гэтага і мы клічам: "Зьмілуйся над намі!"

Цяпер...

*Дагматык пятага тону*

**Вершапесьні**

(*Тон 5*). Цябе, Збавіцелю Хрысьце, што аб'явіўся ў целе, ад неба не адлучыўшыся, песьнямі звонкімі ўзьвялічваем, бо Ты, крыж і сьмерць пацярпеўшы за род наш, як Чалавекалюбец Госпад разбурыў пякельныя вароты і на трэці дзень уваскрос, даючы збаўленьне душам нашым.

*Верш*: Хай **уваскрэсьне Бог...** *і г.д. (Гл. с. 13)*

Слава...

(*Тон 8*). Ты, Хрысьце Божа, духоўнае Сонца справядлівасьці, падвойна прасьвятліў Тваім усячыстым дотыкам таго, хто ад нараджэньня быў пазбаўлены сьвятла. Дык апрамень і нашыя душэўныя вочы, і зрабі нас дзецьмі дня, каб нам з вераю ўслікаць: "Вялікая і невыказная спагадлівасьць Твая да нас, Чалавекалюбча. Слава Табе!"

Цяпер ...

Уваскрасеньня дзень! ... *(Гл. с. 14)*

**Адпушчальныя трапары**

***Трапар нядзельны*** *( тон 5)*. Слова, спрадвечнае з Айцом і Духам, ад Дзевы народжанае для збаўленьня нашага, усхвалім, верныя, і паклонімся Яму: бо Ён захацеў дабравольна целам узысьці на крыж і сьмерць пацярпець, і ўваскрасіць памёрлых слаўным уваскрасеньнем сваім.

Слава ... цяпер ...

***Багародзічны*** *(Тон 5)*. Радуйся, брама Гасподняя непраходная! Радуйся, ахова і апякунка тых, што прыходзяць да Цябе! Радуйся, ціхае прыстанішча! Радуйся Ты, што без мужа нарадзіла ў целе Тварца і Бога Твайго! Не праставай маліцца за тых, што славяць Народжанага ад Цябе і пакланяюцца Яму.

## ЮТРАНЬ

*Трапары як на вячэрні. Служба нядзельная 5 тону. Евангельле нядзельнае 8. Канон Вялікодны (гл. с. 14) і сьлепанароджанага (9 песьня).*

*Пасьля трэцяй песьні :*

**Кандак і ікас Велікодны.** Хоць Ты, Несьмяротны, і зышоў у магілу... *і г.д. (Гл. с. 15)*

***Сядальная песьня сьлепанароджанага*** *(тон 8)*. Уладар усіх сустрэў сьляпога, які сядзеў пры дарозе, плакаў і казаў: "Ня бачыў я ў жыцьці маім зьзяньня сонца, ані сьвятла месяца. Таму прыходжу да Цябе і прашу, чалавекалюбны Уладару Хрысьце Божа, які нарадзіўся ад Дзевы і ўвесь сьвет прасьвятліў, у велічы добрасардчнасьці і міласэрнасьці Тваёй дай мне адпушчэньне грахоў."

*Пасьля шостай песьні:*

**Кандак сьлепанароджанага** *(тон 4)*. З асьлеплымі **вачыма** душы маёй да Цябе прыходжу, Хрысьце і, як некалі сьлепанароджаны, каюся і клічу: "Ты — сьвятло тых, што ў цемры!"

*Ікас.* Хрысьце-Сьвятло, што сьвеціш у цемры, і Настаўнік тых, што ў спакусах, дай мне напіцца з крыніцы невымоўнае мудрасьці і нябеснага розуму, каб я, няшчасны, мог зьведаць Твой цуд ацаленьня сьляпога, пра які расказвае Боская кніга Евангельля. Ён быў сьляпы ад нараджэньня, а Ты яму адчыніў вочы цялесныя і душэўныя, і ён з вераю ўсклікнуў: "Ты — сьвятло тых, што ў цемры!"

*"Больш годную пашаны..." не сьпяваецца.*

**Канон сьлепанароджанага.** *Песьня 9 (тон 5). Ірмас.* Вялікія рэчы ўчыніў Табе Усемагутны: Ён захаваў Цябе пасьля родаў Дзеваю, бо Ты нарадзіла без семя Творцу Твайго. Таму Цябе мы ўзьвялічваем.

Ты даў сябе прыбіць да крыжовага дрэва, Хрысьце Божа, але Ты перамог варожыя сілы і зьнішчыў першы праклён. Таму мы Цябе, як належыць, узьвялічваем.

Калі пекла ўбачыла Цябе з душою ўнізе, яно застагнала і адпусьціла ў страху усіх памёрлых, адчуўшы веліч улады Тваёй. Дзеля гэтага Цябе належна ўзьвялічваем.

Зборышча гэбрэяў напоўнілася зайздрасьцю, убачыўшы знакі і вялікія цуды, якія рабіў Той, хто ўваскрасеньнем сваім паланіў пекла і сілаю сваёю ўзьняў усіх.

Ты, Жыцьцядаўца, тварыў цуды і вяртаў зрок сьляпым; уваскросшы з магілы, як прадказаў, Ты явіўся сьвятым вучням Тваім. З імі разам і мы узьвялічваем Цябе на ўсе вякі.

Слава...: Хвалю Сьвятло-Айца, слаўлю Сьвятло-Сына, пяю веліч Сьвятла-Духа правага, адно Сьвятло неразьдзельнае ў трох асобах — Бога і Уладара ўсяго стварэньня.

Цяпер...: Ты явілася больш прасторнай за неба, Дзева чыстая, бо зьмясьціла ў сабе незьмяшчальнага Бога ў целе, і нарадзіла Збаўленьне ўсіх, хто з верою непахісна славіць Цябе.

*Катавасія.* Цябе, Маці Божая, што вышэй за розум і словы невыказна нарадзіла ў часе Спрадвечнага, мы, верныя, аднадушна ўзьвялічваем.

**Экзапастыляр.** *Вялікодны*: Целам заснуўшы як мёртвы, Уладару і Госпадзе, на трэці дзень Ты ўваскрос і Адама ад тленнасьці ўзьняў, перамогшы сьмерць. Пасха нятленная, сьвету збаўленьне!

Слава...: Вочы майго розуму, асьлеплыя ад змрочнага граху, прасьвятлі Госпадзе, дай мне пакору і абмый мяне слязьмі пакаяньня.

Цяпер...: Збавіцель, ідучы, сустрэў сьляпога. Плюнуўшы на зямлю і зрабіўшы гразь, Ён памазаў яму вочы і загадаў ісьці памыцца ў Сілааме. Ён пайшоў, памыўся і ўбачыў сьвятло Тваё, Хрысьце мой.

**Пахвальныя псалмы**

*Сем песьняў нядзельных 5 тону, тады наступныя:*

*Верш.* Глянь на мяне і зьмілуйся нада мною.

(*Тон 8*). Дзеля вялікай любові Ты, Хрысьце Божа, прыняў цела і ў невыказнай міласэрнасьці Тваёй зжаліўся над тым, хто ад нараджэньня ня бачыў сьвятла. Дакрануўшыся да ягоных зрэнак Тваімі творчымі пальцамі,Ты ўдастоіў яго Боскага зьзяньня. Цяпер, адзіны Добры Сьветладаўца, прасьвятлі і нашыя душэўныя пачуцьці.

Слава...: (*Тон 8*). Хто выкажа сілу Тваю, Хрысьце? Або хто зможа палічыць безьліч цудаў Тваіх? Як дзеля вялікай любові Ты зьявіўся ў дзьвюх прыродах, так і немачным даваў падвойнае аздараўленьне. Ты сьлепанароджанаму адкрыў вочы ня толькі цялесныя, але і душэўныя. Таму ён вызнаў Цябе Богам, што дае ўсім багацьце зьмілаваньня.

Цяпер...: Найблаславёная Ты...

## ЛІТУРГІЯ

**Трапар нядзельны** (*тон 5*). Слова, спрадвечнае з Айцом і Духам, ад Дзевы народжанае для збаўленьня нашага, усхвалім, верныя і паклонімся Яму: бо Ён захацеў дабравольна целам узысьці на крыж і сьмерць пацярпець, і ўваскрасіць памёрлых слаўным уваскрасеньнем сваім.

Слава...

**Кандак сьлепанароджанага** *(тон 4).* З асьлеплымі вачыма душы маёй да Цябе прыходжу, Хрысьце, і як некалі сьлепанароджаны, каюся і клічу: "Ты — сьвятло тых, што ў цемры"

Цяпер...

**Кандак вялікодны** *(тон 8).* Хоць Ты, Несьмяротны, і зышоў у магілу, Ты зьнішчыў пекла ўладу, і ўваскрос пераможна, Хрысьце Божа, жанчынам міраносіцам кажучы "Радуйцеся", і Тваім апосталам супакой даруючы, Ты, што даеш памёрлым уваскрасеньне.

**Пракімен** *(Пс. 75:12,2)*: Выконвайце абяцаньні, дадзеныя Госпаду Богу нашаму.
*Верш.* Бог вядомы ў Юдэі, у Ізраілі вялікае імя Яго.

**Апостал:** Дзеяньні 16:16-34

**Алілуя** *(Пс 118:132,133)*: Глянь на мяне і зжалься нада мною.
*Верш.* Накіруй крокі мае паводле слоў Тваіх.

**Евангельле** : Ян 9:1-38

**Задастойнік:** Анёл усклікнуў Поўнай ласкі: Чыстая Дзева радуйся! І зноў кажу "Радуйся", бо твой Сын уваскрос на трэці дзень з магілы і мёртвых узьняў з сабою. Людзі, весяліцеся.

Сьвяціся, сьвяціся, новы Ерусаліме, бо слава Гасподняя зазьзяла над табой. Радуйся сёньня і весяліся, Сыёне! Ты ж, Чыстая, красуйся, Багародзіца, бо Той, каго ты нарадзіла з мёртвых устаў.

**Прычасьнік.** Хваліце Госпада з нябёсаў, хваліце Яго на вышынях. Алілуя, алілуя, алілуя.

## НЯДЗЕЛЯ ЎВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 5*).Сьвятло людзкой прыроды і вока гэтага сьвету, Ты, Божа і Слова, Творца ўсіх і Ўладару, невыказна вылечыў вочы сьляпога, зьмяшаўшы балота пальцамі, што твораць і балота і зрок. І вось той, хто быў вядомы людзям як сьляпы ад нараджэньня і ня бачыў ніколі сонца, убачыў Цябе — Сонца любові, вобраз Таго, хто дзеля нас у вялікай міласэрнасьці сонца стварыў.

Абдараны ўсімі патрэбнымі членамі і складам людзкога цела, сьлепанароджаны, ня маючы зроку, ня мог гэтага ацаніць; ногі яго і ўсё цела цярпелі ад частага спатыканьня аб каменьне. Пасьля ж таго, як ён атрымаў ад Цябе той вялікі скарб, ён зірнуў на

Сьвятло сьвету і вызнаў Цябе як Бога і Ўладара стварэньня, і Творцу сусьвету.

Той, хто быў раней сьляпым, вызнаў вуснамі, душою і розумам як Уладара сусьвету і Тварца ўсяго стварэньня Таго, хто творчаю рукою адчыніў зрэнкі вачэй яго і вярнуў яму зрок. Ён сьмела прапаведаваў Ісуса, усемагутнага Бога, які ў міласэрнасьці сваёй стаўся чалавекам. Зайздросныя кніжнікі не маглі цярпець ягоных размоваў і ў засьляпленьні сваім выгналі яго, асудзіўшы і Таго, хто вярнуў яму зрок душэўны і цялесны.

*Тры песьні з мінеі*

Слава... цяпер...

(*Тон 2*). Сьлепанароджаны падумаў у сабе і сказаў: "Ці не за грэх бацькоў маіх нарадзіўся я без вачэй? А можа за няверства людзей — як перасьцярога, — я такі? Ня ведаю, калі ноч, а калі дзень, і не магу ўстаяць на нагах маіх, спатыкаючыся аб камяні. Ня бачыў я сонечнага сьвятла, ані вобразу Творцы майго. Дык малюся Табе, Хрысьце Божа: "Глянь на мяне спагадліва і зьлітуйся нада мною."

**Вершапесьні**

(*Тон 5*). Пачэсным крыжом Тваім, Хрысьце, Ты д'ябла пасароміў, і ўваскрасеньнем Тваім джала сьмерці прытупіў, і выбавіў нас ад варотаў сьмерці. Слава Табе, Адзінародны.

Госпадзе, не перастаю грашыць, і не хачу зразумець Тваёй спагадлівасьці да мяне. Разьвей маё неразуменьне, Адзіны Добры, і зьмілуйся нада мною.

Ня дбаючы пра дачаснае і наважыўшыся мужна на мукі, вы, слаўныя мучанікі, ня страцілі надзеі блаславёных і атрымалі ў спадчыну нябеснае валадарства. Маючы сьмеласьць у чалавекалюбнага Бога, выпрасіце сьвету супакой і душам нашым веліч зьмілаваньня.

Слава ... цяпер ...

(*Тон 2*). Ідучы са сьвятыні, Ісус сустрэў чалавека сьляпога ад нараджэньня і, зьлітаваўшыся над ім, памазаў вочы ягоныя гразьзю і сказаў: "Ідзі, памыйся ў Сілааме." Ён памыўся і пачаў бачыць, і аддаў славу Богу. Ягоныя суседзі пыталіся ў яго: "Хто адчыніў твае зрэнкі, якіх ніхто аздаравіць ня мог?." А ён усклікнуў, кажучы: "Чалавек на імя Ісус сказаў мне: Памыйся ў Сілааме, і я пачаў бачыць. Гэта сапраўды той, пра якога Майсей сказаў у Законе, што Ён Хрыстос-Мэсія і Збавіцель душ нашых."

**Адпушчальныя трапары**

*Сьвятога дня*

Слава... цяпер...

*Уваскросны (тон 5).* Слова, спрадвечнае з Айцом і Духам, ад Дзевы народжанае для збаўленьня нашага, усхвалім, верныя, і пакло-німся Яму: бо Ён захацеў дабравольна целам ўзыйсьці на крыж і сьмерць пацярпець, і ўваскрасіць памёрлых слаўным уваскра-сеньнем сваім.

## ПАНЯДЗЕЛАК УВЕЧАРЫ

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 5*). Творца і Ўладар усяго стварэньня стаўся чалавекам дзеля любові да твораў сваіх; узяўшы зямлю і плюнуўшы на яе, Ён вярнуў зрок сьляпому, які вуснамі, душою і розумам вызнаў Яго і прапаведаваў як усемагутнага Бога. Кніжнікі ж і тыя, што былі з імі, асьлепленыя зайздрасьцю і ня могучы глядзець на цуд, адлучаюць ранейшага сьляпога ад грамады і асуджаюць Таго, хто даў яму зрок душэўны і цялесны.

Сьляпы атрымаў перамогу над тымі, што мелі добры зрок: ён убачыў Творцу і Госпада, які вярнуў сьвятло вачам яго, і, ўбачыўшы, вызнаў Яго, як Сьвятло ўсіх, Сына Божага і Ўладара сусьвету. Тыя ж, асьлепленыя злоснай зайздрасьцю, глядзелі і нічога ня бачылі і, змовіўшыся, не захацелі прызнаць цуду.

Падазроным здаўся кніжнікам сьляпы, якому адчыніліся вочы, і яны не паверылі, што ён раней ня бачыў, але абвінавацілі яго, што ён за намоваю Збавіцеля ўдаваў сьляпога. Для іх, асьлепленых душою, цёмнымі былі сьвятыя пісаньні, з якіх зьзяе сапраўднае Сонца, што абнаўляе суботняе дзеяньне, асьвятляе ўсе стварэньні, здымае покрыва з вачэй іх і вяртае зрок раней сьляпым, каб, прасьветліўшыся, яны прапаведавалі сьвету Сьветладаўца.

*Тры песьні з мінеі.*

Слава ... цяпер ...

(*Тон 8*). Ты, Хрысьце Божа, духоўнае Сонца праўды, падвойна прасьвятліў Тваім усячыстым дотыкам таго, хто ад нараджэньня быў пазбаўлены сьвятла. Дык апрамень і нашыя душэўныя вочы, і

зрабі нас дзецьмі дня, каб нам **з вераю клікаць: "Вялікая і невыказная спагадлівасьць Твая да нас, Чалавекалюбча. Слава Табе."**

**Вершапесьні**

(*Тон 5*). Той, хто дае ўваскрасеньне роду людзкому, быў ведзены на ахвяру, быцам ягнё. Уладары пякельныя сумеліся і адчыніліся вароты плачу, бо ўвайшоў Уладар славы Хрыстос, кажучы вязьням: "Выходзьце!", і тым што ў цемры: "Хадзіце да сьвятла!"

Госпадзе, я ў страху перад Табою і не пакідаю рабіць зло. Хто на судзе не баіцца судзьдзі? Або, хочучы аздараўленьня, гнявіць лекара, як я Цябе? Доўгацярплівы Госпадзе, будзь спагадлівы да маёй слабасьці і зьмілуйся нада мною.

Засланіўшыся шчытом веры і ўмацаваўшы сябе знакам крыжа, сьвятыя Твае, Госпадзе, адважна выйшлі на змаганьне і перамаглі д'ябальскую гордасьць і ману; малітвамі іх, Божа ўсемагутны, даруй сьвету супакой і душам нашым багацьце Твайго зьмілаваньня.

Слава ... цяпер...

(*Тон 8*). Дзеля вялікай любові Ты, Хрысьце Божа, прыняў цела і ў невыказнай міласэрнасьці Тваёй зжаліўся над тым, хто ад нараджэньня ня бачыў сьвятла. Дакрануўшыся да ягоных зрэнак Тваімі творчымі пальцамі,Ты ўдастоіў яго Боскага зьзяньня. Цяпер, адзіны Добры Сьветладаўца, прасьвятлі і нашыя душэўныя пачуцьці.

**Адпушчальныя трапары**: *як у нядзелю вечарам (гл. с. 34)*

## АДДАНЬНЕ ВЯЛІКАДНЯ

### ВЯЧЭРНЯ
### (АЎТОРАК УВЕЧАРЫ)

**Сьвятар: Блаславёны** Бог наш справеку, цяпер, **і заўсёды і на вякі** вякоў.

**Людзі**: Амін.

**Сьвятар:** Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў, і тым, што ў магілах, жыцьцё дараваў. (*Тройчы*)

**Людзі**: Хрыстрос уваскрос з мёртвых... (*Паўтараюць тое самае тройчы*).

**Сьвятар**: Хай уваскрэсьне Бог і разьбягуцца ворагі Яго, і хай уцякуць ад Яго ўсе ненавісьнікі Яго.

**Людзі**: Хрыстос уваскрос з мёртвых...

**Сьвятар**: Хай зьнікнуць так, як зьнікае дым, і як тае воск ад агню.

— Так хай зьнікнуць грэшнікі ад аблічча Божага, а праведнікі узрадуюцца.

— Вось дзень, што Госпад стварыў, дзень радасьці і вясельля для ўсіх нас.

— Слава Айцу, і Сыну, і Сьвятому Духу.

— Цяпер і заўсёды, і на вякі вякоў. Амін.

**Людзі**: Хрыстос уваскрос з мёртвых...

**Сьвятар**: Хрыстос уваскрос з мёртвых, сьмерцю сьмерць зваяваў.

**Людзі**: І тым, што ў магілах, жыцьцё дараваў.

*Прыйдзіце, паклонімся...; Псалом 103 і далей звычайны парадак вячэрні.*

**На "Госпадзе, Цябе клічу...":**

(*Тон 2*). Сьлепанароджаны, думаючы ў сабе...; Ідучы са сьвятыні, Ісус сустрэў чалавека сьляпога ... (*Гл. с., 27*)

(*Тон 4*). Сьляпы, для якога ўсё жыцьцё было ноччу, усклікнуў: "Госпадзе, Сыне Давіда, Збавіцелю наш, адчыні зрэнкі вачэй маіх, каб я з усімі ўславіў сілу Тваю."

(*Тон 5*). Ідучы дарогаю, Ты, Госпадзе, сустрэў слепанароджанага чалавека. Вучні, зьдзіўленыя, пыталіся ў Цябе: "Настаўнік, хто зграшыў — ён ці бацькі ягоныя, — што сьляпым нарадзіўся?" А Ты, Збавіцелю мой, адказаў ім: "Ні ён, ані бацькі яго не зграшылі, але каб сіла Божая аб'явілся на ім. Мне трэба рабіць справу Таго, хто паслаў мяне, учынкі, якіх ніхто іншы ня можа рабіць." Сказаўшы гэта, Ён плюнуў на зямлю і, зьмяшаўшы гразь, памазаў вочы сьляпому і сказаў: "Ідзі і памыйся ў Сілаамскай сажалцы." І ён, памыўшыся, выздаравеў і ўсклікнуў "Веру, Госпадзе!" і пакланіўся Табе. Дзеля гэтага і мы клічам: "Зьмілуйся над намі!"

(*Тон 8*). Ты, Хрысьце Божа, духоўнае Сонца справядлівасьці, падвойна прасьвятліў Тваім усячыстым дотыкам таго, хто ад нараджэньня быў пазбаўлены сьвятла. Дык апрамяні і нашыя душэўныя вочы, і зрабі нас дзецьмі дня, каб нам з вераю ўслікаць: "Вялікая і невыказная спагадлівасьць Твая да нас, Чалавекалюбча. Слава Табе!"

Дзеля вялікай любові Ты, Хрысьце Божа, прыняў цела і ў невыказнай міласэрнасьці Тваёй зжаліўся над тым, хто ад нараджэньня ня бачыў сьвятла. Дакрануўшыся да ягоных зрэнак Тваімі творчымі пальцамі,Ты ўдастоіў яго Боскага зьзяньня. Цяпер, адзіны Добры Сьветладаўца, прасьвятлі і нашыя душэўныя пачуцьці.

Слава ... цяпер ...

(*Тон 8*). Хто выкажа сілу Тваю, Хрысьце? Або хто зможа палічыць безьліч цудаў Тваіх? Як дзеля вялікай любові Ты зьявіўся ў дзьвюх прыродах, так і немачным даваў падвойнае аздараўленьне. Ты сьлепанароджанаму адкрыў вочы ня толькі цялесныя, але і душэўныя. Таму ён вызнаў Цябе Богам, што дае ўсім багацьце зьмілаваньня.

**Вершапесьні**

(*Тон 5*). Цябе, Збавіцелю Хрысьце, што аб'явіўся ў целе, ад неба не адлучыўшыся, песьнямі звонкімі ўзьвялічваем, бо Ты, крыж і сьмерць пацярпеўшы за род наш, як Чалавекалюбец Госпад разбурыў пякельныя вароты і на трэці дзень уваскрос, даючы збаўленьне душам нашым.

*Верш:* Хай уваскрэсьне Бог... *і г. д.* *(Гл. с. 13)*

Слава ... цяпер ...

Уваскрасеньня дзень!... *(Гл. с. 14)*

**Адпушчальныя трапары**

***Уваскросны*** *(тон 5).* Слова, спрадвечнае з Айцом і Духам, ад Дзевы народжанае для збаўленьня нашага, усхвалім, верныя, і паклонімся Яму: бо Ён захацеў дабравольна целам ўзысьці на крыж і сьмерць пацярпець, і ўваскрасіць памёрлых слаўным уваскрасеньнем сваім.

Слава... цяпер...

*Багародзічны (Тон 5).* Радуйся, брама Гасподняя непраходная! Радуйся, ахова і апякунка тых, што прыходзяць да цябе! Радуйся, ціхае прыстанішча! Радуйся ты, што без мужа нарадзіла ў целе Тварца і Бога твайго! Не пераставай маліцца за тых, што славяць Народжанага ад цябе і пакланяюцца Яму.

*Літанія "Зьмілуйся над намі, Божа....." і заканчэньне звычайнае.*

## ЮТРАНЬ

Пасьля "Госпад —Бог..." : *трапары як у канцы вячэрні.*

Першая сядальная песьня: *нядзельная 5 тону.*

Другая сядальная песьня (*тон 5*). Суспрадвечны з Айцом і Духам, што апранаешся ў , як Бог, адагнаў немачы людзкія і прасьвятліў зрэнкі сьляпога ад улоньня маці. (*Двойчы*)

*"Убачыўшу ўваскрасеньне Хрыстова...". Псалом 50.*

Канон: *Велікодны*

*Пасьля ытрэцяй песьні*

Кандак сьлепанароджанага *(тон 4).* З асьлеплымі вачыма душы ... *і г. д. (Гл. с. 29)*

Сядальныя песьні (*Тон 1*). Ты адчыніў вочы сьляпому і паказаў юдэям, Збавіцелю мой, невыказную славу Тваю, як існае сьвятло ўсіх. Але яны, асьлепленыя зайздрасьцю, задумалі забіць Цябе, Жыцьцядаўца.

Слава... цяпер...

Ты, Збавіцелю мой, нарадзіўся, як захацеў, зьявіўся нам з уласнай волі Тваёй; Ты пацярпеўяк чалавек і ўваскрос як Бог. Споўніўшы ўсё, Ты ўзьнёсься ў славе на неба і ўзьняў з сабою людзкую прыроду, якую Ты ўславіў.

*Пасьля шостай песьні :*

Кандак і ікас велікодныя. Хоць Ты, Нресьмяротны... *і г. д . (Гл. с. 15)*

*Перад дзевятай песьняю "Больш годную пашаны..." не сьпяваецца.*

Пахвальныя псалмы

(*Тон 4*). Сьляпы, для якога ўсё жыцьцё было ноччу...; Ідучы дарогаю, Ты, Госпадзе...; Ты, Хрысьце Божа, духоўнае Сонца

справядлівасьці...; **Дзеля вялікай любові Ты, Хрысьце Божа...** (*Гл. вячэрню, с. 36*)

*Верш*: Хай уваскрэсьне Бог... *і г.д. (Гл. с. 13)*

Слава ... цяпер ...

Уваскрасеньня дзень! ... *(Гл. с. 14)*

*Вялікае ўсалаўленьне. Пасьля* ***Трапар "Слова спрадвечнае..." і*** *Багародзічны.*

## ЛІТУРГІЯ

*Пачатак Літургіі як на Вялікдзень, уключна з вялікоднымі вершамі*

Трапар *(тон 5)*. Слова, спрадвечнае з Айцом і Духам...

Слава ... цяпер ...

Кандак *(тон 8)*. Хоць Ты, Несьмяротны, і зышоў у магілу, Ты зьнішчыў пекла ўладу, і ўваскрос пераможна, Хрысьце Божа, жанчынам міраносіцам кажучы "Радуйцеся", і Тваім апосталам супакой даруючы, Ты, што даеш памёрлым уваскрасеньне.

Пракімен *(Пс 117:27,1)*. Вось дзень, што Госпад стварыў — дзень радасьці і вясельля для ўсіх нас.
*Верш*. Аддайце падзяку Госпаду, бо Ён добры, бо міласэрнасьць Яго давеку.

Апостал: Дзеяньні 18:22-28

Алілуя. Ты, Госпадзе, уваскросшы, зьлітуешся над Сыёнам, бо ўжо час паказаць спагаду Тваю яму, бо прыйшоў ужо час.
*Верш*. Госпад з неба глядзіць на зямлю, бачыць усіх сыноў Адамавых.

Евангельле : Ян 12:36-47

Задастойнік: Анёл усклікнуў Поўнай ласкі: Чыстая Дзева радуйся! І зноў кажу "Радуйся", бо твой Сын уваскрос на трэці дзень з магілы і мёртвых узьняў з сабою. Людзі, весяліцеся.

Сьвяціся, сьвяціся, новы Ерусаліме, бо слава Гасподняя зазьзяла над табой. Радуйся сёньня і весяліся, Сыёне! Ты ж, Чыстая, красуйся, Багародзіца, бо Той, каго ты нарадзіла з мёртвых устаў.

Прычасьнік. Хваліце Госпада з нябёсаў, хваліце Яго на вышынях. Алілуя, алілуя, алілуя.